ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення
адукацыі Ваўкавыскага
раённага выканаўчага камітэта
П.Е. Красько
14.10.2025

ПАЛАЖЭННЕ аб правядзенні
раённага этапу абласнога конкурсу
фальклорных калектываў
“Шчаслівы той, хто продкаў з
чыстым сэрцам паважае”

Дадзеныя ўмовы вызначаюць парадак арганізацыі і правядзення раённага этапу абласнога конкурсу фальклорных калектываў “Шчаслівы той, хто продкаў з чыстым сэрцам паважае ”(далей – конкурс).

АРГАНІЗАТАРЫ:

упраўленне адукацыі Ваўкавыскага раённага выканаўчага камітэта;

дзяржаўная ўстанова адукацыі “Ваўкавыскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі”.

МЭТЫ І ЗАДАЧЫ:

духоўна-маральнае і эстэтычнае выхаванне дзяцей і моладзі сродкамі каляндарна-святочнай абраднасці і традыцыйнага мастацтва;

усебаковае вывучэнне самабытных з’яў і помнікаў рэгіянальнага фальклору Гродзеншчыны, яго аўтэнтычных форм, каляндарна-святочнай абраднасці і мастацкіх традыцый;

вывучэнне вопыту работы дзіцячых калектываў фальклорнага кірунку устаноў адукацыі, папулярызацыя іх даследчай і творчай дзейнасці.

УДЗЕЛЬНІКІ:

У конкурсе фальклорных калектываў «Шчаслівы той, хто продкаў з чыстым сэрцам паважае» прымаюць удзел фальклорныя аб’яднанні па інтарэсах устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

ПАРАДАК І ЎМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ:

Рэпертуар праграм канкурсантаў павінен складацца з прэзентацыі 2-х каляндарна-абрадавых комплексаў: «Гуканне вясны» і абрада на выбар, які адпавядае мясцовасці калектываў – удзельнікаў. Працягласць кожнага абрада да 20 хвілін.

Удзельнікі конкурсу ў адрас аргкамітэта прадастаўляюць да 27 студзеня 2026 г заяву (Дадатак) на e-mail: volkhudozh@yandex.ru з паметкай “Шчаслівы той, хто продкаў з чыстым сэрцам паважае”.

На выснове прагляду відэаматэрыалаў, раённае журы вызначае ўдзельнікаў абласнога этапу, якія прадстаўляюць у аргкамітэт наступныя матэрыялы:

агульны фотаздымак удзельнікаў калектыву;

спіс неабходных тэхнічных сродкаў для выступлення.

Рэквізітам і дэкарацыямі ўдзельнікі конкурсу не забяспечваюцца.

Патрабаванні да конкурсных праграм:

Удзельнікі прадстаўляюць фальклорныя праграмы, якія скіраваны на змястоўнае раскрыццё мастацкіх традыцый сваёй мясцовасці. Выкананне твораў з іншых рэгіёнаў, а таксама твораў у аўтарскай апрацоўцы — не дазваляецца.

Музычнае суправаджэнне праграм ажыццяўляецца пад акампанемент музычных інструментальных ансамбляў у жывым гучанні.

Касцюмы ўдзельнікаў павінны ўяўляць сабой варыянты арыгіналаў або копій традыцыйных народных касцюмаў сваёй мясцовасці.

Пры падвядзенні вынікаў журы ўлічвае:

наяўнасць і ступень захаванасці ў рэпертуары выканання творчымі калектывамі найпершасных (каранёвых) форм рэгіянальных музычных, харэаграфічных і мастацкіх традыцый (вёскі, раёна, вобласці);

наяўнасць акампанементу ў ансамблевым выкананні на беларускіх народных інструментах;

узровень выканаўчага майстэрства, выкананне спеваў на мясцовым дыялекце;

наяўнасць сапраўдных строяў ці касцюмаў свайго рэгіёна, культуру нашэння касцюма;

выкарыстанне святочна-абрадавай атрыбутыкі.

Па выніках раённага этапу конкурсу вызначаюцца пераможцы і прызёры, якія ўзнагароджваюцца дыпломамі ўпраўлення адукацыі.

САСТАЎ
журы па правядзенні і падвядзенні вынікаў раённага этапу абласнога конкурсу фальклорных калектываў “Шчаслівы той, хто продкаў з чыстым сэрцам паважае”

| | | |
|---|---|---|
| Паўловіч І.М. | - | загадчык сектара выхаваўчай і сацыяльнай работы ўпраўлення адукацыі Ваўкавыскага раённага выканаўчага камітэта |
| Кухцюк В.М. | - | загадчык аддзела дзяржаўнай установы адукацыі “Ваўкавыскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі” |
| Шышмакова М.А. | - | метадыст дзяржаўнай установы адукацыі “Ваўкавыскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі” |
| Шэўчык І.А. | - | культарганізатар дзяржаўнай установы адукацыі “Ваўкавыскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі” |

Дадатак

Заяўка на ўдзел у конкурсе фальклорных калектываў
«Шчаслівы той, хто продкаў з чыстым сэрцам паважае»

| № п/п | Назва калектыву | Установа адукацыі | Ф.І.А. кіраўніка, кантактны тэлефон | Назвы абрадаў | Ссылка на відэазапіс выступлення |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | |